# МЕТАФАРЫЧНЫЯ НАМІНАЦЫІ Ў НАФТАГАЗАВАЙ ТЭРМІНАЛОГІІ

**В. М. Шыленкова, Е. М. Лісоўская**

*Гомельскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт імя П. В. Сухога, Беларусь*

Навуковы кіраўнік М. У. Буракова, канд. філал. навук, дац.

Сучасная нафтагазавая тэрміналогія – адна з самых складаных сістэм тэрмінаў. Развіццё нафтагазавай тэрміналагічнай сістэмы на сучасным этапе яе існавання з’ўляецца адлюстраваннем тэхнічнага прагрэсу, спецыялізацыі нафтагазавай навукі. Адным з найбольш эфектыўных механізмаў стварэння тэрміналагічных адзінак, неабходных для моўнай фіксацыі новых паняццяў, з’яўляецца метафарычная намінацыя [1]. Метафарычныя намінацыі садзейнічаюць набыццю тэрмінамі такой важнай якасці, як агульнапрынятасць і агульнаўжывальнасць у прафесійнай дзейнасці.

**Аб’ектам даследавання нашай работы сталі метафарычныя намінацыі ў нафтагазавай тэрміналогіі, а мэта – даць семантычную характарыстыку нафтагазавых метафарычных тэрмінаў.**

Рэалізацыя пастаўленай мэты прадугледжвае вырашэнне наступных задач:

– выявіць і сістэматызаваць метафарычныя намінацыі ў нафтагазавай тэрміналогіі;

– апісаць іх тэматычныя групы.

Фактычны матэрыял аналізаваўся з выкарыстаннем апісальнага і параўнальнага метадаў, а таксама з элементамі статыстычнага аналізу.

Распаўсюджванне метафарычных тэрмінаў у нафтагазавай тэрміналогіі забяспечвае эфектыўнае функцыянаванне ў мове спецыялістаў. У нашай рабоце метафарычны тэрмін – гэта тэрмін, які пабудаваны шляхам метафарычнага пераасэнсавання лексічнай адзінкі, прыцягненай з пэўнай сферы-крыніцы. Асноўнымі крыніцамі матэрыялу для стварэння метафарычных намінацый у нафтагазавай тэрміналогіі з’яўляюцца: чалавек і быт, якасна-ацэначная характарыстыка і прырода.

Аналіз нафтагазавых тэрмінаў дае магчымасць вылучыць сярод метафарычных тэрмінаў, у залежнасці ад пераносу значэння, найбольш значныя лексіка-семантычных групы: 1) бытавая; 2) якасна-ацэначная; 3) прыродная. Разгледзім кожную з іх.

1. Бытавая група. Да дадзенай катэгорыі адносяцца намінацыі, у аснове якіх ляжыць параўнанне з прадметамі быта і акружэнне чалавека. Даная група суадносіцца са сферай-крыніцай «чалавек і быт». У групе ажыццяўляецца папулярызацыя прыкмет чалавека як жывой істоты з характэрнай яму дзейнасцю, а таксама бытавых прадметаў, якія акружаюць чалавека ў паўсядзённым жыцці. Напрыклад:

– тэрмін *язык* ‘слой падземных вод, які рухаецца па пласту да эксплуатацыйнай свідравіны, на лакальным участку нафтавай або газавай залежы з-за неправільнай распрацоўкі радовішча’ суадносіцца з лексемай-крыніцай *язык* ‘рухомы мышачны орган у ротавай поласці, які з’яўляецца органам смаку, а ў чалавека ўдзельнічае таксама ва ўтварэнні гукавой мовы’;

– тэрмін *крук* ‘прызначаны для падвешвання бурыльных і абсадных труб’ суадносіцца з лексемай-крыніцай *крук* ‘род вялікага цвіка, драўлянага ці металічнага, з загнутым тупым канцом’;

– тэрмін *пастка* ‘аб'ект нафтагазавай геалогіі: прастора навалы суадносіцца з лексемай-крыніцай *пастка* ‘прыстасаванне для лоўлі звяроў’;

– тэрмін *покрыўка* ‘прыродны флюідаупор, прыродны экран, які перашкаджае фільтрацыі’ суадносіцца з лексемай-крыніцай ‘кавалак матэрыялу для пакрывання чаго-н.’;

– тэрмін *бочка (нафтабочка*) ‘аўтамашына з ёмістасцю для перавозкі нафты, можа быць абсталявана помпай для адпампоўкі нафты’ суадносіцца з лексемай-крыніцай *бочка* ‘вялікая цыліндрычная пасудзіна з двума плоскімі днішчамі, зробленая з выпуклых драўляных клёпак, сціснутых абручамі, або з бляхі’;

– тэрмін *скрабок* ‘прызначаны для разбурэння і выдалення глiністай скарынкі са сценкі свідравіны з мэтай забеспячэння больш шчыльнага кантакту цэментавага каменя з рознымі горнымі пародамі ў ствале’ суадносіцца з лексемай-крыніцай ‘вострая лапатка для саскрэбвання чаго-н.’ і інш.

2. Якасна-ацэначная група. Прыкметы данай катэгорыі адлюстроўваюць першасны ўзровень ведаў, для якога характэрна суб’ектыўнае ўспрыняцце якасцей і ўласцівасцей абазначальнага аб’екта, працэсу або з’явы. Напрыклад:

– *трэшчынаватасць* ‘характарыстыка горных парод, якая адлюстроўвае кол–ькасць і якасць (форму, арыенціроўку і інш.) расколін у адзінцы аб'ёму’;

– *тоўсты газ* ‘пластовы газ з газавым фактарам ад 11 да 33 тыс. $м^3$ / $м^3$, г. зн. з утрыманнем кандэнсату ад 30 да 90 $см^3$ / $м^3$’;

– *сырая нафта* ‘прыродная сумесь вялікай колькасці розных вуглевадародаў з прымессю мінералаў і вады’;

– *цяжкі мазут* ‘паліва для мартэнаўскіх печаў з утрыманнем серы 0,5 або 1 %’;

– *сыры газ* ‘вуглевадародны газ, які здабываецца з газавых радовішчаў’;

– *сухі газ* ‘газ з высокім утрыманнем метану, нізкім - цяжкіх УВ’ і інш.

3. Прыродная група. Даная група метафарычных намінацый утворана на базе падабенства з прыроднымі з’явамі і стыхіямі. Прычынай выкарыстання прыродных метафар паслужыла падабенства па форме, стану, колеру і інш. Напрыклад:

– *адкрыты ствол* ‘участак ствала свідравіны без абсадной калоны’;

– *кропка расы газу* ‘паказчык, які вызначае ўмовы пераўтварэння УВ у вадкасць’;

– *зямная кара* ‘верхняя цвёрдая абалонка Зямлі’;

– *цеплавы струмень* ‘рух цяпла з мантыі ў зямную кару’ і інш.

Трэба адзначыць, што пад уздзеянне метафарызацыі могуць трапляць тэрміны як цалкам, так і часткова (асобныя кампаненты тэрмінаў-словазлучэнняў). Так, у тэрміне-словазлучэнні *газавая шапка* ‘верхняя частка залежу, запоўненая газам, які падпіраецца нафтай’ пад уздзеянне метафарызацыі трапляе толькі кампанент *шапка*, які звязаны з лексемай-крыніцай *шапка* ‘галаўны ўбор, звычайна цёплы, мяккі’. Па структуры метафарычныя намінацыі ў нафтагазавай тэрміналогіі можна падзяліць на дзве групы, якія прадстаўлены ў наступнай табліцы:

**Структура метафарычных намінацый ў нафтагазавай тэрміналогіі**

| Тэрміны з поўнай метафарызацыяй | Тэрміны-словазлучэнні з частковай метафарызацыяй кампанентаў |
|---|---|
| адкрыты ствол<br>банка<br>башмак<br>*буй*<br>*выбух*<br>дыслакацыя<br>дэпрэсія<br>капілярныя каналы<br>павук<br>*прыхват*<br>*пячаць*<br>*світа*<br>*складка*<br>*тампон*<br>*уцяжарвальнік*<br>*штучны востраў*<br>*шчыт* і інш. | буравая лябёдка<br>буравы ключ<br>бурыльная свечка<br>бурыльны замок<br>буферная вадкасць<br>вібрацыйнае *сіта*<br>вісячы трубаправод<br>газавая *шапка*<br>газавы *конус*<br>газавы *фантан*<br>газавы *якар*<br>газаразмеркавальныя *сеткі*<br>геалагічнае цела<br>геалагічны профіль<br>геалагічны *ўзрост*<br>геасінклінальны *пояс*<br>геатэрмічная ступень<br>геахімічныя *бар’еры*<br>каламетрычная *бомба*<br>*кольца* Бэціса<br>контур *воднага люстэрка*<br>кропка расы газу<br>*кроплепадобны* рэзервуар<br>малы подых рэзервуара<br>*падэшва* пласта<br>ротарны стол<br>рэзервуарны парк<br>сінклінальная складка<br>станок-качалка<br>сухі газ<br>тоўсты газ<br>этаж распрацоўкі і інш. |

У выніку даследавання фактычнага матэрыялу намі было выяўлена звыш 200 адзінак метафарычных намінацый у нафтагазавай тэрміналогіі, з якіх тэрміны з поўнай метафарызацыяй склалі 34 %, а тэрміны-словазлучэнні з частковай метафарызацыяй кампанентаў – 66 %.

Такім чынам, метафарычная намінацыя ў нафтагазавай тэрміналогіі з'яўляецца неад'емным кампанентам тэрміналагічнай сістэмы беларускай мовы. Наяўнасць такіх намінацый тлумачыцца тым, што навука развіваецца ў межах этнакультурнага ўтварэння, яе мова фарміруецца ў цеснай сувязі з нацыянальнай мовай. Спецыфіка тэрміналагічнай метафарызацыі заключаецца ў прадстаўленні навуковага «невядомага» праз «вядомае» за кошт выкарыстання знаёмага лексічнага матэрыялу ў новым пераасэнсаваным значэнні.

Л і т а р а т у р а

1. Дьяченко, А. П. Метафоры и терминологические устойчивые выражения / А. П. Дьяченко. – Минск : Новое знание, 2003. – 428 с.
2. Нефтяной словарь. – 2016. – Режим доступа: http://www.neftepedia.ru/board/ja/28. – Дата доступа: 12.04.2016.
3. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы: Больш за 65000 слоў / пад рэд. М. Р. Судніка, М. Н. Крыўко. – 3-е выд. – Мінск : БелЭн, 2002. – 784 с.